**ГРАМАДСКАЯ КАМПАНІЯ «ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ»**

# ВЫБАРЫ Ў ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ШОСТАГА СКЛІКАННЯ

**Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання**

**15.08.2016–21.08.2016**

Назіранне ажыццяўляюць актывісты РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў рамках кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары»

## ВЫСНОВЫ

- зарэгістраваныя кандыдаты пачалі свае агітацыйныя кампаніі, але гэты працэс пакуль мала заўважны ў грамадстве; праўладныя прэтэндэнты на дэпутацкі мандат выступаюць перад выбаршчыкамі пераважна на сходах, арганізаваных у памяшканнях, для гэтага выкарыстоўваецца адміністрацыйны рэсурс саміх кандыдатаў і іх давераных асоб, якія ў большасці з'яўляюцца кіраўнікамі розных узроўняў;

- АВК не заўсёды анансуюць час і месца правядзення сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі;

- адзначаны выпадкі перашкод у публікацыі агітацыйных матэрыялаў апазіцыйных кандыдатаў (патрабаванні ўзгадніць, скарэктаваць змест гэтых матэрыялаў); дзеючае выбарчае заканадаўства не прадугледжвае патрабавання ўзгаднення тэкстаў выбарчых друкаваных матэрыялаў друкарнямі і не накдадае такіх абавязкаў на саміх кандыдатаў;

- пачалася трансляцыя выступаў кандыдатаў па дзяржаўным тэлебачанні і радыё; зафіксаваны асобныя выпадкі адмоваў кандыдатаў скарыстацца сваім правам на выступ па тэлебачанні, таксама ёсць факт забароны паказу выступу аднаго з кандыдатаў у дэпутаты;

- інфармацыя Цэнтральнай камісіі пра абскарджанне не адлюстроўвае рэальную сітуацыю ў сёлетняй выбарчай кампаніі[1], ЦВК зусім не публікуе звесткі па судовых разглядах, усё гэта пярэчыць замацаванаму арт. 13 ВК прынцыпу адкрытасці і галоснасці выбараў;

- станоўчай практыкай з'яўляецца тое, што амаль усе судовыя рашэнні (за выключэннем рашэнняў Віцебскага абласнога суда) змешчаны на сайтах абласных і Мінскага гарадскога суда ў раздзелах, прысвечаных выбарам;

- паводле кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», шэраг кандыдатаў абскардзілі рашэнні АВК у вышэйстаячыя камісіі і ў суды; з іх на рашэнні АВК па адмове ў рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты 21 скарга пададзена ў ТВК (1 задаволена); у суды на рашэнні ТВК аб адмове ў задавальненні скаргаў пададзена 16 скаргаў (з іх 3 задаволены; усе станоўчыя рашэнні прыняў Гродзенскі абласны суд)[2]. Такім чынам, у выніку працэдуры абскарджання спіс кандыдатаў у дэпутаты павінен быў павялічыцца на чатыры асобы.

## I. ПАЧАТАК АГІТАЦЫЙНАЙ КАМПАНІІ

Згодна Каляндарнаму плану, этап перадвыбарчай агітацыі пачынаецца з дня рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты і доўжыцца па 10 верасня 2016 г. уключна. У рэгіёнах праяўляюць актыўнасць пераважна праўладныя кандыдаты ў дэпутаты (праводзяць сустрэчы з выбаршчыкамі ў памяшканнях). На месцах амаль не відаць дзейнасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, чые кандыдаты ўдзельнічаюць у выбарчай кампаніі. У некаторых кандыдатаў пакуль не зарэгістраваныя давераныя асобы, не зацверджаны графік сустрэч з выбарцамі і інш. Пры гэтым усе кандыдаты стварылі спецыяльныя фонды для аплаты паслугаў па вырабу агітацыйнай друкаванай прадукцыі. Ідуць трансляцыі іх выступаў па ТВ і радыё. У цэлым назіральнікамі пакуль адзначаецца пасіўны, незаўважны для выбаршчыкаў характар выбарчай кампаніі.

У Слуцкай ВА №67 на гэтым тыдні з пяці зарэгістраваных прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат трое пачалі свае агітацыйныя мерапрыемствы. Давераныя асобы праўладнага кандыдата па гэтай акрузе, галоўнага рэдактара дзяржаўнай газеты «Слуцкі край» Валянціны Ражанец, пераважна кіраўнікі прадпрыемстваў, дэпутаты мясцовага узроўню, выкарыстоўваючы свой адміністрацыйны патэнцыял арганізоўваюць сходы і выступаюць на іх. Аналагічная сітуацыя ў Маладзечненскай гарадской ВА № 72, па якой ідзе намеснік старшыні Маладзечненскага райвыканкама Людміла Канановіч, у яе давераных асобах таксама кіраўнікі розных узроўняў і самы шчыльны графік сустрэч з выбаршчыкамі. У Салігорскай гарадской ВА №68 зарэгістраваны чатыры асобы, з якіх толькі кандыдат ад АГП Аляксандр Малочка актыўна працуе з выбаршчыкамі.

Некаторыя кандыдаты пакідаюць выбарчую кампанію па ўласнай ініцыятыве, практычна без тлумачэнняў. Беспартыйная Інэса Зелянкевіч, вылучаная па Барысаўскай

[1] Дадзеныя ЦВК адлюстроўваюць сітуацыю на 20 чэрвеня і тычацца толькі Мінскай гарадской ВК (атрымліваецца, што ўсяго ад пачатку выбарчай кампаніі разгледжана толькі дзве выбарчыя спрэчкі). Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-PPNS6-Elect8.pdf.
[2] Інфармацыя кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» па стане на 20 жніўня.

сельскай ВА №63 ад калектыва СШ № 7, падала ў АВК заяву аб зняцці яе кандыдатуры з выбараў. Заява Зелянкевіч была задаволена на закрытым пасяджэнні без высвятлення абставінаў гэтага ўчынку. У парушэнне арт. 69 ВК перад галасаваннем па заяве Зелянкевіч сябры АВК не высвятлялі прычыны зняцця ёю сваёй кандыдатуры. Але 18 жніўня на сайце Барысаўскага райвыканкама з’явілася інфармацыя аб тым, што прычыны зняцця Зелянкевіч сваёй кандыдатуры прызнаныя паважлівымі.

*Цэнзура выступаў і агітацыйных матэрыялаў*

Не ўсе кандыдаты паспелі надрукаваць агітацыйныя матэрыялы. Некторыя сутыкнуліся з фактамі цэнзуры сваіх перадвыбарчых выступаў і тэкстаў друкаваных агітацыйных матэрыялаў.

Падобныя праблемы ўзніклі, у прыватнасці, у кандыдатаў ад АГП Уладзіміра Шанцава (Магілёўская сельская ВА №88) і Сяргея Смалякова (Магілёўская-Прамысловая ВА №87). Супрацоўнікі Магілёўскай друкарні ім С. Собаля адмовіліся друкаваць іх улёткі без папярэдняга «ўзгаднення» іх зместу. Трэба адзначыць, што дзеючае выбарчае заканадаўства не прадугледжвае патрабавання ўзгаднення тэкстаў выбарчых друкаваных матэрыялаў друкарнямі і не накладае такіх абавязкаў на саміх кандыдатаў.

Рэдакцыя газеты «Вечерний Брест» прапанавала старшыні абласной арганізацыі БСДП (Грамада) Ігару Маслоўскаму (Брэсцкая-Памежная ВА №4) унесці змены ў тэкст сваёй агітацыйнай публікацыі. У афіцыйным адказе выконваючага абавязкі рэдактара газеты Наталлі Васюк адзначаецца, што матэрыял Ігара Маслоўскага не прымаецца да публікацыі з-за выразаў, якія могуць быць успрынятыя як «абраза на адрас людзей розных прафесій». Маецца на ўвазе наступны фрагмент: «Не падтрымлівайце на выбарах лекараў, ваенных і іншых добрых людзей – яны кандыдаты ад улады. Усе яны добрыя людзі пакуль на сваім месцы, але ўсе яны залежныя ад начальства і пераўтвараюцца ў “дрэнных” дэпутатаў. Гэтыя добрыя людзі галасуюць за тое, што ім кажуць. Менавіта з іх маўклівай згоды падвысілі пенсійны ўзрост, пазбавілі стажу тых, хто служыў у арміі, быў у дэкрэтным адпачынку, вучыўся ва ўніверсітэце і г.д. Менавіта яны падтрымалі падатак на беспрацоўных і нічога не зрабілі для стварэння новых рабочых месцаў»[3].

АВК Светлагорскай ВА №46 адмовілася друкаваць біяграфію кандыдата ад партыі «Зялёныя» Юрыя Ляшэнкі ў тым выглядзе, у якім ён яе прадставіў. Камісія палічыла агітацыяй частку біяграфіі, дзе гаворыцца, што кандыдат займаецца грамадскай дзейнасцю, стварае працоўныя месцы, дапамагае інвалідам. Юрый Ляшэнка накіраваў скаргу ў ЦВК і атрымаў адказ, што акруговай камісіі прапанавана ўключыць біяграфію цалкам: «ЦВК раіць выбарчым камісіям пры падрыхтоўцы тэксту плакату ўлічваць, перш за ўсё, інтарэсы выбаршчыкаў, гэта значыць прадстаўляць інфармацыю, якая дазволіць ім скласці аб’ектыўнае ўяўленне аб кандыдатах». Пасля ў АВК Светлагорскай ВА №46 запэўнілі, што біяграфія Ляшэнкі будзе апублікавана без купюр і рэдакцыі.

16 жніўня па тэлебачанні быў паказаны выступ кандыдата ад АГП па Гомельскай-Юбілейнай ВА №31 Уладзіміра Няпомняшчых, пры гэтым частка надпісу «За Беларусь

[3] Даступна на: http://elections2016.spring96.org/be/news/84447.

без Лукашэнкі» на яго адзенні была закрыта, у выніку чаго глядач бачыў толькі словы «За Беларусь».

Не ўсе выступы, запісаныя ў справаздачны перыяд, былі паказаныя. Не выйшаў у эфір выступ Паўла Стэфановіча, кандыдата ад АГП, які балатуецца па Паўднёва-Заходняй ВА №98 г. Мінска. Большая частка тэзісаў Стэфановіча, з якімі ён звяртаўся да выбарцаў, была прысвечаная аднаму з пунктаў яго перадвыбарчай праграмы – легалізацыі марыхуаны. Паводле каментара старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай, выступ не паказалі, таму што ён парушаў нормы заканадаўства, якое супрацьдзейнічае наркагандлю. Павел Стэфановіч звярнуўся са скаргай у камісію па СМІ пры ЦВК.

Белтэлерадыёкампанія забараніла выстаўляць паказаныя на канале «Беларусь-3» ролікі кандыдатаў у сацыяльных сетках, спасылаючыся на свае аўтарскія правы на гэты агітацыйны відэакантэнт. Старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька ў праграме «Клуб рэдактараў» на тэлеканале «Беларусь-1» паведаміў, што апазіцыйныя кандыдаты пачалі адмаўляцца ад выступаў па ТВ.

## II. СМІ

У большасці дзяржаўных СМІ асноўныя матэрыялы выбарчай кампаніі – гэта афіцыйная інфармацыя пра дзейнасць ЦВК і акруговых выбарчых камісій. Змест і аб’ём публікацый, прысвечаных праўладным кандыдатам, у некаторых рэгіянальных выданнях указвае на няроўнае стаўленне да ўдзельнікаў перадвыбарчага працэсу.

Газета «Светлагорскія навіны» (№ 62 ад 16.08.2016) у рубрыцы «Выбары 2016» апублікавала разгорнуты матэрыял пакуль пра аднаго з пяці кандыдатаў па Светлагорскай ВА №46. Герой артыкула – дзеючы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Галіна Філіповіч.

Газета «Полацкі веснік» (№ 64 ад 16.08.2016) на першай старонцы прыводзіць інфармацыю пра адкрыццё разліковага рахунка, час сустрэч з даверанымі асобамі і выбарцамі кандыдата па Полацкай гарадской ВА № 27 Наталлі Гуйвік, таксама дзеючага дэпутата Палаты прадстаўнікоў. Звесткі пра рахункі трох іншых кандыдатаў па акрузе склалі адзін, менш падрабязны матэрыял, надрукаваны пазней.

Газета «Жодзінскія навіны» (ад 16.08.2016) у рубрыцы «Народ и власть» дае артыкул, у цэнтры якога асоба кандыдата па Жодзінскай ВА №64, генеральнага дырэктара ААТ «БЕЛАЗ» Дзмітрыя Заблоцкага. Назва артыкула сугучна слогану выбарчай праграмы Заблоцкага.

Недзяржаўныя СМІ ў рэгіёнах, за рэдкім выключэннем, мала асвятляюць выбарчую кампанію.

## III. АБСКАРДЖВАННЕ АДМОЎ У РЭГІСТРАЦЫІ

Паводле дадзеных ЦВК, па пытаннях рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты пададзена 38 зваротаў, з іх 5 – у Цэнтральную камісію, 29 – у тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, 4 – у акруговыя выбарчыя камісіі. З гэтай статыстыкі ЦВК не вынікае, колькі менавіта скаргаў пададзена на рашэнні АВК па адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты. Трэба адзначыць, што ў сёлетняй выбарчай кампаніі адсутнічае аператыўная

статыстычная інфармацыя пра пададзеныя скаргі, што не адпавядае прынцыпу адкрытасці і галоснасці выбараў, замацаванаму арт. 13 ВК.

Згодна звестак кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», на рашэнні АВК па адмове ў рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты пададзена 21 скарга ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі. З іх 1 – была задаволена. Магілёўская абласная выбарчая камісія задаволіла скаргу прэтэндэнта ад ЛДПБ Барыса Аляшкова на рашэнне АВК Магілёўскай-Кастрычніцкай ВА № 86. Падставай для адмовы ў рэгістрацыі з'явілася тое, што прэтэндэнт не прадставіў спраўку аб месцы працы. Пасля разгляду справы Магілёўская абласная камісія вырашыла, што парушэння з боку прэтэндэнта няма, і абавязала акруговую камісію зарэгістраваць Аляшкова кандыдатам.

На рашэнні тэрытарыяльных камісій аб адмове ў задавальненні скаргаў прэтэндэнтаў у кандыдаты ў суды пададзена 16 скаргаў. З іх задаволены скаргі Максіма Штэйнвальда, Сяргея Мякекі («Гавары праўду») і Антона Войцехава (АГП). Усе станоўчыя рашэнні прыняў Гродзенскі абласны суд, які абавязаў акруговыя камісіі зарэгістраваць кандыдатамі ў дэпытаты гэтых прэтэндэнтаў. Яшчэ адна скарга будзе разгледжана Гродзенскім абласным судом у панядзелак, 22 жніўня.

Варта адзначыць, што гэтым разам амаль усе судовыя рашэнні (за выключэннем рашэнняў Віцебскага абласнога суда) апублікаваныя на адпаведных сайтах абласных і Мінскага гарадскога суда ў разделах, прысвечаных выбарам. Гэта з'яўляецца станоўчай практыкай.